УДК 902/904

# НОВЫЯ ЗНАХОДКІ ПАЛЕАЛІТЫЧНАГА ВОБЛІКУ З БАСЕЙНА р. НЁМАН[1]

**Гаршкоў А. Д.**
Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»
(г. Гродна, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. Артыкул прысвечаны ўвядзенню ў навуковы зварот археалагічных матэрыялаў, атрыманых пад час паверхневых збораў, праведзеных аўтарам у 2024 г. каля в. Багушоўка (Гродзенскі раён). Знешнія характарыстыкі калекцыі дазваляюць выказаць гіпотэзу аб іх прывязцы да палеалітычнага часу.

Ключавыя словы: палеаліт, крамянёвы інвентар, пацiна, люстраж, рэльеф.

1 Даследаванне выканана ў рамках гранта БРФФД-Навука М № Г24М-005 «Палеаэканамічныя аспекты жыццядзейнасці паляўнічых-збіральнікаў фінальнага палеаліту ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана» (кіраўнік – Гаршкоў А. Д.).

Summary. The article is devoted to the introduction into scientific circulation of archaeological materials obtained during surface collections conducted by the author in 2024 near the village of Bahusoŭka (Hrodna district). The external characteristics of the collection allow us to hypothesize that they date back to the Paleolithic period

Key words: paleolithic, flint tools, patina, luster, relief.

Апошнія некалькі гадоў для тэрыторыі Беларусі назіраецца некаторы “бум” адкрыццяў палеалітычных помнікаў і знаходак асобных артэфактаў. Перш за ўсё, гэта звязана са з’яўленнем цікавасці да гэтага перыяду і правядзеннем сістэматычных, хоць і тэрытарыяльна абмежаваных палявых даследаванняў. Інфармацыя аб гэтых помніках паступова ўводзіцца ў навуковы зварот, існуе пэўная дыскусія аб іх храналогіі, культурнай прыналежнасці ці ўвогуле – артэфактнасці [8-9]. Калі раней помнікі палеалітычнага часу, перш за ўсё, звязваліся з паўднёвай часткай нашай краіны, то зараз падобныя аб’екты фіксуюцца вышэй 54 градуса паўночнай шыраты [9]. Дадзены артыкул прысвечаны аналізу невялікай калекцыі крамянёвых артэфактаў палеалітычнага вобліку, якая была сабрана аўтарам работы ў 2024 г. каля в. Багушоўка (Гожскі сельскі савет, Гродзенскі раён).

Пад час археалагічнай разведкі каля вышэйназванага населенага пункта, паміж чыгуначнай дарогай і шашой Н-6037 Гродна-Парэчча было зафіксавана пяць новых археалагічных аб’ектаў. На адным з іх, які атрымаў назву Багушоўка 3, размешчаным 0,95 км ад паўночна-заходняй ускраіны вёскі, за 0,68 км на паўночны захад ад прыпыначнага пункта цягнікоў “Багушоўка” было знойдзена чатыры крамянёвыя прадметы з пацінай белага колеру. Само месцазнаходжанне лакалізуецца на марэнным пагорку памерам 180 х 95 м, які быў складзены з супеску чырвона-бурага колеру з вялікай колькасцю камянёў і жвіру. У глебавым плане, дадзеная тэрыторыя размешчана на мяжы зон распаўсюджвання дзярнова-падзолістых, супясчаных, суглiністых і глiністых глеб з дзярнова-падзолістымі пясчанымі глебамі [1]. Згодна карты распаўсюджання чацвярцічных адкладаў на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, у гэтай мясцовасці прысутнічаюць водна-ледавіковыя адклады паазерскага часу [7]. Тым не менш, згодна фізіка-геаграфічнаму раянаванню В. А. Дзяменцьева, гэтая тэрыторыя адносіцца да Гродзенскага ўзвышша [6]. Аналагічная сітуацыя паводле карты геамарфалагічнага раянавання тэрыторыі Беларусі [4, с. 658-659]. Аднак не выключна, што месцаразмяшчэнне як помніка Багушоўка 3, так і іншых, адкрытых у гэтай мясцовасці, якраз знаходзіцца на мяжы Гродзенскага ўзвышша і Азёрскай водна-ледавіковай нізіны. Дадзенае пытанне з’яўляецца даволі важным, так як генэзіс дадзеных раёнаў розны: першы складзены, перш за ўсё, адкладамі сожскага этапа прыпяцкага зледзянення, а другі – паазерскімі. Гэта акалічнасць вельмі важная пры вызначэнні адноснай храналагічнай прывязкі зафіксаваных артэфактаў.

Уласна помнік Багушоўка 3 выдзелены ў асобны пункт, так як мае адрознае тапаграфічнае размяшчэнне і матэрыялы, якія па сваіх, перш за ўсё, знешніх характарыстыках, выбіваюцца з агульнага кантэксту. Калекцыя месцазнаходжання складаецца з чатырох прадметаў: фрагмента крамянёвага жаўлака рэтушаванага; адшчэпа скарыністага рэтушаванага, адшчэпа падскарыністага са слядамі біфасіяльнай апрацоўкі і рэтушы, адшчэпа рэтушаванага (скрабло?).

Першы з пералічаных прадметаў прадстаўлены фрагментам жаўлака са слядамі жаўлачнай скарынкі і ўключэннямі, з участкам паўстромкай рэтушы, якая ўтварае невялікія выступы. Паверхня артэфакта нясе на сабе сляды акатанасці, люстража, забітасці краёў, трэшчыны і выветрывання. Увесь прадмет пакрыты пацінай белага колеру, таўшчынёй каля 0,5 мм. Памеры: даўжыня – 7,74 см; шырыня – 3,97 см; таўшчыня – 2,49 см.

Другі прадмет, які папярэдне інтэрпрэтуецца як адшчэп скарыністы, на жаль, не нясе на сабе відавочных слядоў расшчаплення, а менавіта – пяткі, ударнага бугарка. Магчыма гэта звязана са станам захавання прадмета, дзе на артэфакце фіксуюцца сляды акатанасці, люстража, забітасці краёў. Аднак не выключна, што пятка або кропка ўдару, так як адшчэп можа быць аднесены да так званага скола першага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

цыклу, быў страчаны ў выніку другаснай апрацоўкі – рэтушавання, якое мае на некаторых участках шматузроўневы характар. Увесь прадмет пакрыты пацінай белага і малочна-блакітнага колераў. Памеры: даўжыня – 4,04 см; шырыня – 4,93 см; таўшчыня – 2,32 см.

Трэці прадмет – фрагмент жаўлака са слядамі жаўлачнай скарынкі і ўчасткам паўстромкай рэтушы, якая ўтварае невялікую выемку. Акрамя гэтага, на жаўлаку прасочваюцца серыйныя, аднабакова накіраваныя негатывы папярэдніх сколаў. Паверхня артэфакта нясе на сабе сляды акатанасці, люстража, забітасці краёў і выветрывання. Увесь прадмет пакрыты пацінай белага і малочна-блакітнага колераў. Памеры: даўжыня – 4,97 см; шырыня – 3,56 см; таўшчыня – 1,8 см.

Апошні прадмет у калекцыі помніка Багушоўка 3 прадстаўлены адшчэпам рэтушаваным, які можа быць інтэрпрэтаваны як скрабло. Нягледзячы на адсутнасць відавочных прыкметаў расшчаплення, на ўмоўна дарсальнай паверхні прысутнічаюць серыйныя, аднабакова накіраваныя негатывы папярэдніх сколаў. На гэтай жа паверхні фіксуецца паўстромкая і стромкая рэтуш, якая прысутнічае амаль па ўсім контуры прадмета. Паверхня артэфакта нясе на сабе сляды акатанасці, люстража, забітасці краёў, трэшчыны і выветрывання. Увесь прадмет пакрыты пацінай белага і малочна-блакітнага колераў. Памеры: даўжыня – 6,14 см; шырыня – 6,2 см; таўшчыня – 1,82 см.

Цікавасць да падобных артэфактаў выклікана, перш за ўсё, апошнімі вынікамі пошуку і даследавання палеалітычных помнікаў на тэрыторыі Беларусі [2; 5; 8-9]. З кожным годам колькасць падобных пунктаў становіцца ўсё большай, але разам з тым расце і колькасць навуковых пытанняў. Самай галоўнай, на наш пункт гледжання, з'яўляецца праблема "артэфактнасці" прадметаў і іх храналагічнай прывязкі. У дачыненні да вышэйназваных знаходак, нельга са стопрацэнтнай упэўненасцю казаць аб іх штучным паходжанні на аснове тых загатовак, якія на нашу думку, былі выкарыстаны чалавекам. На жаль, амаль ва ўсіх артэфактаў адсутнічаюць стандартныя прыкметы першаснага расшчаплення. Толькі на двух прадметах фіксуюцца негатывы папярэдніх сколаў, якія маюць адносна ўпарадкаваны характар. існуе таксама праблема ідэнтыфікацыі другаснай апрацоўкі, а менавіта – рэтушаванне. Справа ў тым, што пры пераадкладанні матэрыялаў, якое безумоўна, адбылося з нашымі знаходкамі, адбываецца ўздзеянне на крамянёвыя прадметы, напрыклад, "абабіўка" края, падобная на рэтуш. Гэтая акалічнасць не дазваляе нам цалкам абапірацца на другасную апрацоўку, як прыкмету артэфактнасці. Аднак на вышэйабазначаных прадметах рэтуш мае лускаватавы характар, у некаторых выпадках – прыступкавы, што не характэрна для сколаў, атрыманых у выніку прыроднага ўздзеяння.

Што датычыцца храналагічнай прывязкі, то ўлічваючы знешнія прыкметы ўсіх артэфактаў, а менавіта – люстраж, сляды забітасці і акатанасці, а таксама трэшчыны на некаторых прадметах, можна зрабіць выснову, што яны пэўны час знаходзіліся пад уздзеяннем водна-ледавіковых адкладаў. У выніку гэтых працэсаў на знаходках таксама ўтварылася паціна белага, белага і малочна-блакітнага колераў. Зыходзячы са стану некаторых рабрын на артэфактах, не выключна, што пасля прадметы ізноў патрапілі ў водна-ледавіковыя адклады, пасля чаго, ужо ў выніку антрапагеннага ўздзеяння з'явіліся на паверхні. Калі з апошнім этапам "археалагізацыі" зразумела – ён адбыўся ў галацэнавы ці калі больш вузка – у гістарычны час, то перыяд траплення знаходак у тую тапаграфічную і магчыма, стратыграфічную сітуацыю застаецца нам невядомым. Калі зыходзіць з гіпотэзы аб старажытнасці дадзеных матэрыялаў, яны не маглі трапіць у гэтыя адклады пазней 14-10 тыс. кал. гадоў таму, калі гэтая тэрыторыя вызвалілася ад лёдавых мас і была заселена паляўнічымі-збіральнікамі фінальнага палеаліту [3]. Матэрыялы гэтага перыяду былі зафіксаваны на суседніх помніках і маюць іншыя тэхніка-марфалагічныя і знешнія характарыстыкі. Таксама зыходзячы з саміх прадметаў і той тапаграфіі, дзе яны зафіксаваны, цалкам магчыма, што яны паходзяць з размытых больш ранніх адкладаў. На карысць гэтай гіпотэзы могуць гаварыць знаходкі на воз. Цітна (Titnas) (Паўднёвая Літва). У пункце С, сярод пясчана-жвіровых адкладаў, зафіксаваныя крамянёвыя артэфакты са слядамі знешняга ўздзеяння (паціна, люстраж). Літоўскі археолаг Э. Шатавічус матэрыялы датуе раннім-сярэднім палеалітам і перыядам ад максімума апошняга зледзянення да дрыяса III [10, p. 76-80].

Акрамя гэтага, на помніку Кашэўнікі (Гродзенскі раён), пры рэканструкцыі і прыстасаванні старога чыгуначнага моста пад аўтамабільны, у водна-ледавіковых адкладах быў зафіксаваны археалагічны матэрыял. На жаль, яго датыроўка зараз мае істотны дыяпазон (больш 100 тыс. гадоў таму) і мае толькі стратыграфічнае абгрунтаванне, але безумоўна наяўнасць падобных артэфактаў сведчыць пра засваенне паўночна-заходніх абшараў Усходне-Еўрапейскай раўніны ў палеаліце [2, с. 26-28].

Такім чынам, аналіз знешніх і тэхніка-марфалагічных характарыстык крамянёвых артэфактаў, якія паходзяць з калекцыі помніка Багушоўка 3, паказвае, што яны могуць быць звязаны з самай старажытнай эпохай у гісторыі чалавецтва – палеалітам. Пры гэтым, ускосныя даныя дазваляюць меркаваць, што іх з'яўленне адбылося не раней чым 14-10 тыс. гадоў таму?. Аднак для пацвярджэння або абвяржэння дадзенай гіпотэзы патрэбна правесці на помніку стацыянарныя палявыя даследаванні з прыцягненнем спецыялістаў у галіне прыродазнаўчых навук, чым мы і плануем заняцца ў бліжэйшым палявым сезоне.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Аношка, В. С. Глебавая карта / В. С. Аношка // Атлас па геаграфіі Беларусі [карты]. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2005. – С. 13.
2. Вашанаў, А. Ранні і сярэдні палеаліт Беларусі: знаходкі і адкрыцці / А. Вашанаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2024. – № 9. – С. 22–29.
3. Горшков, А. Д. Кремневые комплексы памятников финального палеолита на территории Озёрской низменности / А. Д. Горшков, А. А. Добриян // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыі і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2018. – Том. 1, №2. – С. 61–70.
4. Геология Беларуси / [В. И. Абраменко и др.]; под ред. А. С. Махнача [и др.]; Национальная академия наук Беларуси, Институт геологических наук. – Минск, 2001. – 814 с.
5. Горшков, А. Д. Кремневые артефакты из горизонтов водно-ледниковых отложений на территории Беларуси: к постановке проблемы / А. Д. Горшков // Актуальная археология 6 : материалы Междунар. науч. конф. молодых ученых 4–7 апр. 2022 г., г. Санкт-Петербург. – СПБ. : ИИМК РАН, 2022. – С. 23–27.
6. Дементьев, В. А. Основные черты рельефа и геоморфологические районы Белоруссии / В. А. Дементьев // Вопросы географии Белоруссии. – 1960. – Вып. 1. – Минск, 1960. – С. 5–17.
7. Карта четвертичных отложений Гродненской области / составлен Республиканским унитарным предприятием "Научно-производственный центр по геологии" (Государственное предприятие "НПЦ по геологии"). – Минск : НПЦ по Геологии, 2020. – URL : https://gisportal.basnet.by/media/geolog/chetvertich_grodno.jpg (дата доступа: 06.03.2025).
8. Селезнев, Ю. В. Геологическое строение и возраст четвертичных отложений раннепалеолитического местонахождения Огово I в Республике Беларусь / Ю. В. Селезнев [и др.] // Материалы I Белорусского географического конгресса: к 90-летию факультета географии и геоинформатики Белорусского государственного университета и 70-летию Белорусского географического общества, Минск, 8–13 апр. 2024 г. В 7 ч. Ч. 6. Актуальные проблемы физической географии и устойчивого природопользования / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Е. Г. Кольмакова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2024. – С. 165–169.
9. Vashanau, A. Middle Palaeolithic flint artefacts from the territory of Belarus / A.Vashanau [et al.] // Crossing the borders. Interregional and cross–cultural interactions in thecontext of lithic studies (15th SKAM Lithic Workshop) : abstract book of Int. conf., Minsk, Oct. 17–19, 2018 / Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus ; Eds.: V. Asheichyk [et al.]. – Minsk : Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, 2018. – P. 45–46.
10. Satavicius, E. Titnago kasimo ir apdirbimo dirbtuves prie Titno ezero / E. Satavicius // Archaeologia Lituana. – 2012. – Vol. 13. – P. 66–83.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Мал.** 1. Крамянёвыя матэрыялы з месцазнаходжання Багушоўка 3.
Малюнкі аўтара

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова